# АБ ВЫНІКАХ ПЕРШАГА ТУРА ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ЯКІЯ АДБЫЛІСЯ 14 МАЯ 1995 ГОДА

Паведамленне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў

Разгледзеўшы пратаколы акруговых выбарчых камісій, Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў паведамляе:

У спісы выбаршчыкаў па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь былі ўключаны 7445820 грамадзян Рэспублікі Беларусь. Атрымалі выбарчыя бюлетэні 4832308 выбаршчыкаў. У галасаванні прынялі ўдзел 4821199 выбаршчыкаў, або 64,7 працэнтаў.

У Брэсцкай вобласці прынялі ўдзел у галасаванні – 69,2 працэнта, у Віцебскай вобласці – 68,5 працэнта, у Гомельскай вобласці – 67,0 працэнта, у Гродзенскай вобласці – 65,3 працэнта, у Магілёўскай вобласці – 64,3 працэнта, у Мінскай вобласці – 69,7 працэнта, у горадзе Мінску – 52,4 працэнта выбаршчыкаў.

Для правядзення выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь было ўтворана 260 выбарчых акруг. У іх балаціраваліся 2348 кандыдатаў у дэпутаты. Такім чынам, у сярэднім па адной выбарчай акрузе балаціраваліся больш чым 9 кандыдатаў у дэпутаты і толькі ў адной выбарчай акрузе балаціраваўся адзін кандыдат.

У першым туры выбараў выбары адбыліся ў 235 выбарчых акругах. Дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выбраны ў 18 выбарчых акругах.

У 216 выбарчых акругах, дзе выбары адбыліся, у адпаведнасці з артыкулам 56 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь” будзе праведзены другі тур галасавання па двух кандыдатах у дэпутаты, якія атрымалі ў першым туры выбараў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў.

У 24 выбарчых акругах выбары не адбыліся. У адной (Маладзечанскай Паўднёва-Усходняй № 198) выбарчай акруге з-за дапушчаных парушэнняў выбары прызнаны несапраўднымі.

Паведамленні аб выніках выбараў па кожнай выбарчай акрузе апублікаваны акруговымі выбарчымі камісіямі ў мясцовым друку.

Спіс зарэгістраваных дэпутатаў публікуецца.

Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь
па выбарах і правядзенню
рэспубліканскіх рэферэндумаў

22 мая 1995 года